# СТУДЭНЦКАЯ газэта




#3, 28 сьнежня 2004

**АД РЭДАКЦЫІ**

Ну што, спадарства, дачакаліся? Вось стаіць яна на парозе, вялікая і жахлівая (а для кагосьці такая родная і мілая сэрцу) СЭСІЯ.

Рэдакцыя "Студэнцкай газэты" ўзяла сябе ў рукі, паспрабавала мысьліць пазытыўна, пастаянна прыгадваючы "Сэсія праходзіць, а студэнты застаюцца", ды вырашыла зрабіць усім навагодні ды калядны падарунак — новы нумар.

2004 год — здаецца і ня круглая дата, але неяк хочацца падвесьці вынікі альбо прынамсі ўзгадаць, дзякуючы якім падзеям гэты год застаўся ў душах і сэрцах студэнтаў Беларусі. Студэнцкая газэта прапануе свой КАЛЯНДАР.

У Кіеве страйкавалі больш за дзесяць ВНУ, а ў масавых акцыях пратэсту за апошнія месяцы ўзялі ўдзел каля 15 тысячаў студэнтаў. У нашым нумары — кароткае апісаньне ўкраінскіх падзеяў.

Як той казаў, пасьля атамнага выбуху выжывуць толькі прусакі ды студэнты, бо пасьля нашых інтэрнатаў магчыма ўсё (Куды зьнікаюць імбрыкі ды чаму няма вады ў душах? — чытайце пра праблемы інтэрната МДТК).

Адвечны біч студэнтаў — хранічны недасып. Як прачнуцца на першую пару ці на іспыт — усё ў інструкцыі па пабудцы!

Парадокс студэнцкага жыцьця: праблемаў столькі, што перастаеш зьвяртаць на іх увагу. І яшчэ адна адметная рыса — ніхто так не весяліцца як студэнты! Сэсія не замінае нам сьвяткаваць Новы год і Каляды. Дык адарвемся напоўніцу, бо



Фота Юры Сідуна

# сэсія пройдзе, а студэнты – застануцца!

## КАЛЯНДАР 2004

У **студзені** студэнты ЭГУ выступілі ў падтрымку свайго рэктара А.Міхайлава, якога Міністэрства адукацыі прымушала сысьці з пасады.

**E**veryday
**H**aving
**U**s

**Люты** запомніўся ліквідацыяй Міжнароднага гуманітарнага інстытуту.

**1 красавіка** Міністэрства адукацыі "пажартавала" — зьявіўся загад №283 "*О неотложных мерах по организации идеологической работы в вузах*". Таксама ў красавіку каманда БДУ заняла 3-е месца на сусьветным чэмпіянаце па праграмаваньні, а ў Менску адбыўся першы канцэрт ROCK'by у падтрымку Дэкларацыі Правоў Студэнтаў.

ROCK'by
студэнцкі рок-канцэрт

**У траўні** студэнты Беларускага камэрцыйнага інстытуту кіраваньня, а таксама Менскага тэхнікуму эканомікі й кіраваньня зладзілі акцыю пратэсту супраць закрыцьця сваіх навучальных установаў. Яны сабраліся каля ўваходу ў Міністэрства адукацыі з патрабаваньнем аднавіць заняткі. Акрамя таго распрацаваная



і прынятая Дэкларацыя Правоў Студэнтаў. Нечаканка месяцу: "*Будь готов пять лет, а может и больше работать по распределению*", — заявіў Лукашэнка.

**Ліпень** — пасьля шматмесяцовага ўціску ЭГУ зачынілі.

**Верасень** быў багаты на падзеі: курс па ідэалёгіі зрабілі абавязковым ва ўсіх вышэйшых і сярэдніх навучальных установах, у Менску адбылася акцыя пратэсту "Хочам вучыцца па-беларуску". Праз два тыдні менскія студэнты зьвярнулі ўвагу на праблемы зь інтэрнатамі — "Шэсьце бяздомных студэнтаў" мела вялікі рэзананс у прэсе.






У гэты час каля шасьці тысячаў віцебскіх студэнтаў аблвыканкам пасылае "на бульбу", хаця раней намесьнік міністра адукацыі сьцьвярджаў, што масавых студэнцкіх выездаў у калгасы сёлета ня будзе.

**Кастрычнік** запомніўся загонамі на датэрміновае галасаваньне на парляманцкіх выбарах і рэфэрэндуме. І яшчэ адна значная для студэнтаў падзея — падвысілі стыпэндыі.

З 17-га **лістапада** за ўдзел у мітынгу могуць пазбавіць навуковай ступені. ■

## НАВІНЫ. ПАДЗЕІ. ФАКТЫ

### Мінадукацыі зноў паабяцала ўзмацніць кантроль за разьмеркаваньнем

Міністэрства адукацыі прыняла рашэньне ўзмацніць кантроль за працаўладкаваньнем выпускнікоў дзяржаўных вну, што навучаліся за бюджэтныя грошы. Як паведаміла АТН, прынятае рашэньне аб тым, што калі выпускнік не зьяўляецца па месцы разьмеркаваньня, то ён павінен **альбо выплаціць грошы за навучаньне дзяржаве, альбо вярнуць дыплём.**

Гэта ўжо другое падобнае паведамленьне службы навінаў БТ. Першае прагучала ў траўні адразу пасьля знакамітай заявы Лукашэнкі: "*Будь готов пять лет, а может и больше работать по распределению...*"

Новы закон пакуль не прыняты, але зараз знаходзіцца на разглядзе ў Парляманце і з магчымымі праўкамі будзе зацверджаны ўвесну.

*Кансультацыямі па пытаньнях разьмеркаваньня займаецца Задзіночаньне Беларускіх Студэнтаў. У сьнежні Старшыня Рады ЗБС Воля Кузьміч абараніла на выдатна дыплём у БДЭУ менавіта па праблеме прымусовага разьмеркаваньня, дзе даказала неканстытуцыйнасьць існаваньня гэтай зьявы і прапанавала свой праект рэформы. Вашы пытаньні па гэтай праблеме можна задаць на форуме сайта studenty.by.*

### Студэнты займаюцца прымусовай дабрачыннасьцю

Штомесяц студэнты гомельскіх вну мусяць выдаткоўваць грошы са сваіх стыпэндыяў на карысьць дзяржавы. У кастрычніку такая "дабрачыннасьць" адбылася праз набыцьцё лятарэі "Скарбніца", якую Міністэрства культуры заснавала з мэтай атрыманьня дадатковых сродкаў на будаўніцтва нацыянальнай бібліятэкі. У мінулыя разы гэта была грашова-рэчавая лятарэя "Гамяльчанка", заснаваная гомельскім аблвыканкамам.

### На філфаку БДУ перастала існаваць катэдра беларускай літаратуры ХХ стагодзьдзя

На філялягічным факультэце Белдзяржунівэрсытэту катэдра беларускай літаратуры ХХ стагодзьдзя аб'яднаная з катэдрай гісторыі культуры. Кіраўніцтва факультэту сьцьвярджае, што зроблена гэта ў рамках адмысловай праграмы рэструктурызацыі БДУ. Некаторыя супрацоўнікі лічаць, што такія захады можна паставіць у адзін шэраг зь ліквідацыяй Беларускага гуманітарнага ліцэю ды Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту.

### Нямецкія ўнівэрсытэты прывіталі беларускіх студэнтаў — былых навучэнцаў ЭГУ

68 пяцікурсьнікаў зачыненага ўладамі ЭГУ працягнуць сваю вучобу ў некалькіх нямецкіх унівэрсытэтах — у Франкфурце-на-Одэры, Бэрліне, Саарбрукэне.

Больш за ўсё ЭГУ-шнікаў будзе навучацца ў міжнароднай нямецка-польска-францускай установе ў Віядрыне. Мяркуецца, што ў будучым годзе Віядрына атрымае статус фондавага ўнівэрсытэту, і тады ўнівэрсытэт сам зможа даваць стыпэндыі студэнтам-выгнаньнікам.

Сёлета Інстытут нямецкіх дасьледаваньняў — колішні партнэр ЭГУ – вымушаны быў зрабіць адмысловы зварот да нямецкіх арганізацыяў і ўстановаў з просьбай падтрымаць былых навучэнцаў Эўрапейскага ўнівэрсытэту. Спонсарамі вучобы ў выніку сталі: нямецкі МЗС, некалькі палітычных фундацыяў, уключна з такімі буйнымі фондамі як Конрада Адэнаўэра і Генрыха Бёля, шэраг прыватных асобаў.

### Стыпэндыя Хайгенса для навучаньня ў Галяндыі

Праграма прапануе выбітным студэнтам-замежнікам магчымасьць навучаньня пэрыядам ад 3 да 10 месяцаў у Галяндзкім унівэрсытэце ці ў адным з дасьледчых інстытутаў Нідэрляндаў.

Стыпэндыя Хайгенса прадугледжаная для студэнтаў, якія амаль альбо цалкам скончылі навучаньне. Заяўкі прымаюцца і ад грамадзянаў Беларусі. Апошні тэрмін падачы – 1 лютага 2005 году. Падрабязьней – на http://www.nuffic.nl/huygens/

### Чэхаў вызвалілі ад прызыву ў войска

Чэхія скасавала ўсеагульны вайсковы абавязак, што існаваў у краіне на працягу 140 гадоў. Прэзыдэнт Чэхіі Вацлаў Клаўс падпісаў закон, згодна якому з 1 студзеня 2005 года ўзброеныя сілы будуць камплектавацца толькі з прафэсыяналаў. Іх колькасьць скароціцца на 9 тысячаў і агулам складзе каля 35 тысячаў. Акрамя таго паводле новага закону скасоўваецца альтэрнатыўная служба.

### Італійскія студэнты будуць вывучаць гісторыю мафіі

Студэнты рымскага ўнівэрсытэту Tre з пачатку 2005 году будуць вывучаць гісторыю мафіі.

Чытаць лекцыі студэнтам запрошаныя буйныя спэцыялісты па барацьбе з мафіяй. Гэты курс мае вялікую папулярнасьць сярод студэнтаў, больш за 430 чалавек выказалі жаданьне яго праслухаць. ■

# Украінскія студэнты сказалі "ТАК!"

**Напэўна, ніхто не чакаў, што ўкраінскія студэнты так масава і досыць зладжана будуць змагацца за свае пазыцыі. Што ўжо казаць, калі нават некаторыя рэктары ўнівэрсытэтаў заклікалі падтрымаць Віктара Юшчанку як законна абранага прэзыдэнта Ўкраіны.**



Адразу ж пасьля першага туру прэзыдэнцкіх выбараў, што адбыўся 31 кастрычніка 2004 году, у Кіеве пачаліся пратэсты супраць фальсыфікацыяў. Арганізатарамі студэнцкіх мітынгаў выступілі грамадзкая ініцыятыва "Пора", грамадзкі рух "Чиста Україна" і вольная ініцыятыва "Студентська хвиля".

У першыя ж дні лістапада 13 навучальных установаў Львоўшчыны стварылі моладзевы страйкавы камітэт, які ставіў сваімі мэтамі забесьпячэньне рэагаваньня моладзі і студэнцтва на фальсыфікацыю выбараў. Грамадзкая ініцыятыва "Пора" 17 лістапада пачала студэнцкі страйк. Асноўным патрабаваньнем было правядзеньне чыстых выбараў. Студэнты таксама заклікалі моладзь запісвацца ў назіральнікі і патрабавалі ад адміністрацыяў навучальных установаў навесьці парадак у інтэрнатах, не палітызаваць навучальны працэс, не перасьледваць студэнтаў за іхныя перакананьні. Студэнты абвесьцілі ўсёй Украіне ды сьвету "Мы разам, нас шмат і нас не перамагчы!", "Усход і Захад — разам!", "Сумы — мы з табою!"

23 лістапада студэнты Кіева-Магілянскай акадэміі пачалі страйк і заклікалі выкладчыкаў і студэнтаў іншых ВНУ Ўкраіны далучыцца да акцыяў пратэсту. Рэктары большасьці кіеўскіх ВНУ дазволілі сваім студэнтам прымаць удзел у агульнанацыянальным страйку ў падтрымку Віктара Юшчанкі. Па словах рэктара ўнівэрсытэту імя Тараса Шаўчэнкі Віктара Скапенкі, кіраўніцтва прыняла такое рашэньне пасьля перамоваў з удзельнікамі мітынгу.

У адказ на такія актыўныя дзеяньні студэнтаў міністар адукацыі Васіль Крамень падпісаў дэклярацыю, у якой абяцаў не перасьледаваць навучэнцаў ВНУ за палітычныя перакананьні. Затым міністэрства адукацыі Ўкраіны нават зьвярнулася да кіраўнікоў усіх ВНУ ды іншых навучальных установаў Кіева з заклікам пасяліць студэнтаў, што прыбылі ў сталіцу на акцыі пратэсту, у інтэрнатах ды іншых будынках, якія належаць ВНУ.

Міністэрства адукацыі ды навукі стварыла "гарачую лінію" для паведамленьняў пра выключэньні студэнтаў і звальненьні выкладчыкаў з навуковых установаў за палітычныя погляды. Праз пэўны час міністар адукацыі Васіль Крамень заявіў, што ўсе студэнты, што былі выключаныя з ВНУ па палітычных матывах, адноўленыя.

Украінскія студэнты давялі ўсяму сьвету сваю еднасьць і прымусілі палітыкаў лічыцца са сваёй думкай.

*Алена Талапіла*

## ІНСТРУКЦЫЯ ПА ПАБУДЦЫ АБ'ЕКТА ТЫПУ СТУДЭНТ

Час падымацца надышоў і прайшоў, а ён (яна) яшчэ сьпіць. Вашыя дзеяньні:

1. Проста падысьці і гучна сказаць: "Уставай!" (магчымыя варыяцыі: "Пад'ём! Пажар! Табе павестка з ваенкамату (жаночай кансультацыі)! У цябе сын (дачка, невядомая жывёлінка) нарадзіўся!") і г.д.
2. Паўтарыць П.1 чатырнаццаць разоў.
3. Завесьці будзільнік і паднесьці яго ў зьвінячым стане да вуха студэнта.
4. Упэўніцца, што П.3 не спрацоўвае, выкінуць будзільнік куды падалей, пасьля чаго вярнуцца да П.2.
5. Груба патрэсьці студэнта за плячук (нагу, руку, галаву і г.д.), калі ён іх мае.
6. Сумясьціць П.2 з П.5, пасьля чаго стомлена сесьці на стул, выціраючы ўзмоклы лоб насоўкай.
7. З гнеўным крыкам сьцягнуць са студэнта коўдру.
8. З крыкам жаху накрыць яго зноў.
9. Выгнаць з ложку ўсіх лішніх (n-1) разоў, дзе n — колькасьць тых, хто ў ложку.
10. Угледзецца ў твар студэнта і з крыкам: "Якога * * * ты робіш у маім ложку!" паспрабаваць перавярнуць ложак.
11. Вярнуцца да П.6.
12. Патлумачыць напужаным суседзям, што ўсё ў парадку, у вас нікога ня рэжуць, пасьля чаго выканаць П.5, які часам пераходзіць у П.П. 7, 8 і 10.
13. Дастаць зь лядоўні бутэльку халоднага піва і пабулькаць ім над вухам студэнта.
14. Выпіць П.13 і зь ціхім жахам падумаць пра непазьбежны паўтор П.6 з плаўным пераходам у П.12.
15. Махнуць на ўсё рукой.
16. Прынесьці з кухні два кубкі халоднай вады і выліць адзін зь іх на галаву студэнта, пасьля чаго ўпэўніцца ў адсутнасьці жаданага эфэкту і выліць другі на галаву сабе, пасьля чаго моцна задумацца пра П.15.
17. У адчаі паўтарыць П.П.6 і 11 з дапамогай мегафона, праклінаючы іх усіх, разам узятых, да сёмага калена.
18. Зазірнуць пад ложак і выгнаць адтуль усіх, хто апынуўся там пры ажыцьцяўленьні П.9, і паспрабаваць выканаць П.5, але ўжо з-пад ложку.
19. Паставіць на магнітафон любімую музыку студэнта, уключыць яе на поўную моц і зьбегчы першаму.
20. Выратавацца ад раззлаваных суседзяў, выключыць П.19, устаць над студэнтам і ціха прашыпець: "С-с-сво-лач!"
21. Выканаць П.7 без П.8, таму што ўжо ўсё роўна, а таксама пазбавіць студэнта прастыні, падушкі, матраца, усяго, што было пад ім заначкавана, і ложка, з грукатам перамясьціўшы студэнта на падлогу.
22. Выканаць П.5 у асабліва вычварнай форме
23. Паўтарыць П.22 некалькі разоў, бо спадабалася.
24. Выканаць П.П.6, 11, 12, 14, 16, 17 і 23 з рознымі варыяцыямі, пасьля чаго канчаткова перайсьці да П.15.
25. Заснуць.
26. Прачнуцца ад гнеўных крыкаў і праклёнаў у свой бок ад нарэшце ачунялага аб'екту з нагоды таго, што яго не пабудзілі своечасова і ён усё праспаў.
27. Зноў выканаць П.15 і П.25, у гатоўнасьці адчуць наступным ранкам на сабе ўсе пункты з 1 па 24.

Добрай раніцы!!!

**З ЖЫЦЬЦЯ АДНАГО ІНТЭРНАТУ**

## Паляваньне на імбрыкі

Пра студэнцкую гарбату "Белыя ночы" ведаюць многія. Яна складаецца толькі з аднаго кампанэнту – кіпеню, па прычыне адсутнасьці ў беднага студэнта іншых складнікаў. Але і гэтай "радасьці" пазбаўляюць нашага брата. Пагалоўная канфіскацыя імбрыкаў па ўсім інтэрнаце МДТК прайшла мінулай вясной, і да гэтай пары забаронена імі карыстацца. А як існаваць? Есьці ды піць усё роўна хочацца. А пліты працуюць па раскладзе: 7:00-8:00, 9:00-12:30, 16:30-18:00, 19:00-21:-00. Паспрабуй уласны расклад сумясьціць з такім "гнуткім" графікам.

Бывае, устанеш – пліты ўжо выключаныя, ідзеш на пары галодны ды злы. Прыходзіш з занятку – зноў не трапляеш на пліты. Калі ёсьць імбрык, можна хоць гарбаты папіць – ужо нештачкі.

Як гэта было ў нашым інтэрнаце? Прыходзілі ў пакой, шукалі, знаходзілі, запісвалі, а потым забіралі. Некаторым пашанцавала, удалося схаваць імбрычак.

З пытаньнем: "Дык чаму ж забіраюць?" прыстала да выхавацелькі ўжо ня ў першы раз. Яна доўга не хацела даваць адказу. Потым узгадала выпадак пажару ў Маскве, паведаміла, што па падліках электрыка імбрык мае высокае напружаньне і цягне амаль 2 кВт за адно выкарыстаньне. А ў нас у інтэрнаце праводка слабая, можа адбыцца пажар. Так, імбрыкі цягнуць шмат, а кампутары, тэлевізары, фэны – меней? Можа, іх таксама забараніць? Карацей, усё робіцца для таго, каб студэнты сталі выміраючым відам.

Зараз імбрыкі канфіскуюць. А гады два таму, калі засяляліся ў інтэрнат, самі ж выхавацелі раілі скідвацца да купляць электраімбрыкі, таму што пліты ня могуць працаваць увесь час. Цяпер яны даюць іншую параду: можна ўставаць раненька, гатаваць што-небудзь і затусоўваць у тэрмас. І сьмешна, і крыўдна.

І яшчэ нам можна мець кіпяцільнікі, якія, па словах выхавацелек, трэба хаваць. Хаваць ад каго? Ад іх жа самых? А калі разабрацца, кіпяцільнік больш небясьпечная рэч, чым імбрык, і ад іх часьцей узьнікаюць пажары. Але што рабіць, людзі прыстасаваліся пры дапамозе гэтай незамяняльнай рэчы ня толькі кіпяціць ваду для гарбаты ці кавы, але і варыць рыс, макароны, бульбу. Ды што там – нават суп падагрэць можна.

Студэнты выжываюць у любых умовах. Але нешта стаміліся мы ўжо пастаянна пацьвярджаць гэта на сваім прыкладзе.

*Воля Власавец*

## Невыгодныя ўмовы

Цярпі, студэнт!..

Цывілізацыя не да ўсіх яшчэ пагрукалася ў дзьверы. І складаецца такое адчуваньне, што інтэрнат МДТК (Менскага дзяржаўнага тэхналягічнага каледжу) яна ўвогуле абышла за некалькі кілямэтраў. Умовы існаваньня зьдзіўляюць сваім спартанскім характарам: пліты працуюць па раскладзе, гэта значыць, калі ты хочаш паесьці, ты забіваеш на ўсе справы альбо харчуешся няякаснай ежай хуткага прыгатаваньня. Яшчэ адміністрацыя ўсімі сіламі змагаецца зь лішняй вагой студэнтаў – пасьля 21:00 есьці нельга – пліты не працуюць, выкарыстаньне іншых сродкаў для гатаваньня ежы забароненае. Практыкуецца такая цікавая рэч, як агульная прыбіральня (мужчынская і жаночая – дзьве ў адной), не абсталяваная дзьверкамі, якія маглі б зачыняцца.

Але акрамя такіх чалавечых патрэбаў, як есьці ды наведваць прыбіральню, студэнты жадаюць яшчэ і прымаць душ. У жыхароў інтэрната МДТК такая магчымасьць ёсьць! Роўна раз на тыдзень – у чацьвер (не дарма ж перад Вялікаднем ёсьць такі "чысты чацьвер", у які па традыцыі ўсё прыбіраюць ды чысьцяць). Дарэчы, душы два – мужчынскі ды жаночы – за што дзякуй адміністрацыі. Досыць доўгі час прыходзіцца, натуральна, прастаяць у чарзе, а потым цябе чакаюць сем кабінак, якія не зачыняюцца і зь якіх толькі чатыры знаходзяцца ў працоўным стане, і халодная ці летняя, а апошнім часам нават цёплая (!) вада.

Зараз галоўнае, каб душ увогуле не зачынілі. Студэнтам, што жывуць у інтэрнаце ня першы год, ужо прыйшлося перажыць тры цяжкія месяцы немыцьця. Сантэхнікі хацелі давесьці душы да працоўнага стану, але ж за мінулае лета зьдзейсьніць гэтую апэрацыю ў іх не атрымалася. Жыхары інтэрнату моцна і ня скардзіліся, спадзяваліся, што эўрадушы зробяць іх хоць зашчэпку якую паставяць ды кабінкі адрамантуюць. Але марна. Чым займаліся сантэхнікі ў душах увесь гэты час, невядома...

Добра хоць, што летам занядбаныя студэнты пераж ылі "залатыя часы" – можна было памыцца ў бацькоў ці на скрайні выпадак у якой-небудзь рачулцы ці возеры. Але зараз, узімку, паехаць на Менскае мора для гігіенічных працэдураў рызыкнуць толькі самыя марозаўстойлівыя...

*Юлія Янюк*


studenty.by

Штодзённыя студэнцкія навіны. Артыкулы. Форум. Фотаальбомы. Каталёг студэнцкіх рэсурсаў.

Далучайся!



в.а. рэдактара: **Алена Талапіла**

Пасьведчаньне аб рэгістрацыі ў Міністэрстве інфармацыі РБ: №1377 ад 1.09.1999

Распаўсюджваецца бясплатна.

Выдаецца клясычным правапісам беларускай мовы

дызайн і вёрстка: **Юра Сідун**

Адрас рэдакцыі: 220013, Менск, вул. Дарашэвіча 4, кв. 2

тэл./факс: (+017) 232 27 43
e-mail: hazeta@studenty.by

заснавальнікі: **Алесь Міхалевіч, Ігар Баярэнка**

Надрукавана ў друкарні "Артлекс", г. Вільня, Літва

Замова №1827.
Наклад 10000.